■ Выбар сэрцаў

# «Ірына лечыць целы, а я — душы»

## Чым жыве сям'я адзінага ў Беларусі лютэранскага пастара

**«Журналісты тэлефанавалі, пыталіся, чаму не запрасіў іх на вянчанне. А я не думаў, што людзям гэта будзе цікава». Мінулай восенню галоўнай навіной гродзенскай свецкай хронікі стала вяселле лютэранскага пастара Уладзіміра ТАТАРНІКАВА. Фотаздымкі святара і яго прыгожай нявесты Ірыны трапілі тады ледзь не ва ўсе мясцовыя СМІ. Яшчэ б: гэта было першае вянчанне за ўсю гісторыю кірхі.**

**З Уладзімірам і Ірынай мы сустракаемся ў іх дома. У джынсах, пад гарбату і жарты, у адным з нямногіх пакояў, дзе цяпер не ідзе рамонт, размаўляем пра асабістае і спрабуем растлумачыць, якая яна — сучасная пастарская сям'я.**



### Выбар з дзяцінства

Пастарам Уладзімір Татарнікаў прызначаны з 2009 года. Свой прыход у святарства ён успамінае так:

— Я з міліцэйскай сям'і. Бацькі працавалі ў органах, брат таксама. А я ўвесь час з маленства хацеў служыць у царкве. Я ўвогуле быў актыўным дзіцем. Усе гурткі наведваў, якія толькі магчыма. І мяккай цацкі, і фларыстыкі, а яшчэ танцы, каратэ, лёгкая атлетыка. На тэлебачанні быў, спрабаваў сябе ў якасці вядучага. Але чамусьці цягнула менавіта ў святары.

Бацька першапачаткова быў супраць таго, каб я паступаў у семінарыю вучыцца. Спадзяваўся, што таксама па яго шляху пайду. Але я лічыў, што ў нашай сям'і дастаткова міліцыянераў. Трэба таксама паслужыць, але крыху ў іншай сферы. Як кажуць лютэране, чалавек павінен працаваць па прызванні. І не трэба саромецца гэтага.

### «Цешча дзеля мяне асвоіла інтэрнэт»

— У нас звычайна так: Вова расказвае, а я слухаю і ківаю, — з усмешкай папярэджвае Ірына.

— Яна ж доктар (тэрапеўт у паліклініцы. — **Аўт.**). Прывыкла слухаць. А ў мяне іншая сфера, — апраўдваецца Уладзімір. — У нас тандэм: Іра лечыць целы, а я душы.

***— Раскажыце, як пазнаёміліся.***

**Уладзімір:** — Гэта было ў сяброў на вяселлі.

**Ірына:** — Мая сяброўка, якая выходзіла замуж, раней мімаходзь расказвала, што ёсць у іх прыяцель такі, служыць пастарам у Гродне. І тады нават не звярнула ўвагі. Потым перасекліся на вяселлі — і пачалося.

***— І чым зачапілі адно аднаго?***

**Уладзімір:** — Ну тут ясна. Я — прыгажосцю *(смяецца)*. А Іра чым спадабалася — навуцы невядома.

**Ірына:** — Зразумеў, напэўна, што яго чалавек. Спачатку перапісваліся, як гэта цяпер у моладзі, праз сацыяльныя сеткі. Вова мяне знайшоў. Потым ужо на спатканні хадзіць сталі. Я тады вучылася ў Гродне ў медыцынскім універсітэце, на шостым курсе.

***— Пра лютэранства што-небудзь ведалі (Ірына з праваслаўнай сям'і. — Аўт.)?***



**Ірына:** — Увогуле нічога.

**Уладзімір:** — А цяпер яна эксперт у гэтым, можа вам па палічках усё раскласці *(усміхаецца)*. У нас пра лютэран мала ведаюць. Некаторыя мае знаёмыя думаюць, што гэта нейкая секта. Пачынаеш ім тлумачыць: лютэранская абшчына афіцыйна зарэгістравана. Не аргумент. І толькі калі кажаш, што нас паказваюць па дзяржаўным тэлебачанні, тады згаджаюцца: ну так, пра секту не сталі б расказваць.

***— Як навіну пра зяця-пастара ўспрынялі Ірыніны бацькі?***

**Уладзімір:** — Было праблемай расказаць ім, што Іра сустракаецца са святаром. Таму што сёння, на жаль, у паняцці многіх людзей святар — гэта чалавек ва ўзросце, з доўгай барадой, далёкі ад сучаснасці. Бацькі думалі: як гэта так, дачка атрымала вышэйшую адукацыю, а стане матушкай. Будзе сядзець у царкве, прадаваць свечкі. А калі Іра сказала, што я да таго ж і лютэранскі пастар, бацькі былі ў яшчэ большым шоку. Цешча нават, для таго каб больш даведацца пра лютэранства і кім з'яўляецца зяць, асвоіла інтэрнэт.

### Вянчанне, як у амерыканскіх фільмах

***— Чытала, што ваша вяселле было даволі традыцыйным: выкуп, загс, рэстаран...***

**Уладзімір:** — Калі прыйшоў тамада, каб абмеркаваць арганізацыйныя пытанні, ён адразу спытаў: «Я пачытаў пра лютэранства, але нідзе не напісана, як у вас праходзіць вяселле». Мы яму кажам: няма пэўных правілаў. Адзіная галоўная традыцыя — вянчанне. Сказаць «так» адзін аднаму, «і ў радасці і ў горы, пакуль смерць не разлучыць». У нашай царкве вянчанне носіць характар малітвы, мы просім Божага благаславення для сям'і.

Гасцям з Ірынага боку хапіла, што цырымонія праходзіла ў кірсе. Гэта ўражанне надоўга.

**Ірына:** — Усім вельмі спадабалася. Казалі: як у амерыканскіх фільмах. Тата пад руку вядзе нявесту да алтара, перадае мужу, гучыць арган... Многія арган чулі ўпершыню.

***— Жонцы лютэраніна трэба пераходзіць у канфесію мужа?***

**Уладзімір:** — Гэта неабавязковая ўмова. Нават калі муж святар. Таму што нельга сілком перацягваць з адной канфесіі ў іншую. Чалавек павінен сам да гэтага прыйсці. Цяпер жа многія сем'і праз спрэчкі аб рэлігіі распадаюцца. Асабліва калі справа даходзіць да хрышчэння дзіцяці.

***— А ў вашай сям'і спрэчак наконт гэтага не ўзнікне?***

**Уладзімір:** — У нашай царкве дзіця хрысціцца яшчэ малым, але мы не кажам, што ён ужо лютэранін. Чалавек становіцца хрысціянінам, рукі Бога яго аберагаюць. А потым, калі яму споўніцца 16 гадоў, ён праходзіць абрад канфірмацыі: пацвярджае сваё хрышчэнне і выбірае тую канфесію, у якой сябе бачыць. Мы не лічым, што гэта няправільна, калі чалавек пераходзіць у праваслаўе ці каталіцтва. Ён жа застаецца ў хрысціянскай царкве, толькі ў іншай канфесіі.

***— Дарэчы, колькі разоў пастар можа ажаніцца?***

**Уладзімір:** — Нейкага правіла наконт гэтага няма. Пытанне ў іншым: які прыклад ты паказваеш тым, хто цябе слухае? Наша царква, як і ўсе, не ўхваляе разводаў.

### Сям'я пастара заўсёды на віду

***— Замужжа за пастарам накладвае нейкія абавязкі, забароны?***

**Ірына:** — Я забарон пакуль не заўважала. Хаджу ў тым адзенні, у якім зручна. Так, трэба захоўваць прыстойны выгляд, але нічога звыш.

**Уладзімір:** — Жонка пастара павінна падтрымліваць хатні ачаг і сустракаць гасцей. Прычым тым, што ў доме, дзе мы жывём, праходзяць і мерапрыемствы абшчыны. Тут пастаянна ёсць людзі. І псіхалагічна гэта не кожны можа вытрымаць. Для сустрэч з прыхаджанамі ў нас ёсць асобны пакой, але ўсім жа хочацца павітацца з Ірай, спытаць, як справы, паклікаць гарбаты папіць. Не заўсёды атрымліваецца мець асабістую прастору.

Да таго ж пастар на мерапрыемствах, якія праходзяць у жыцці абшчыны, заўсёды павінен быць з жонкай.

***— На нядзельных службах Ірына таксама мусіць быць з вамі ў кірсе?***

**Уладзімір:** — Па магчымасці. Але ўсе мы грэшныя, і лянота часам перамагае слова мужа *(смяецца)*. Я калі вяду службу, падчас прапаведзі на яе прыкладзе кажу: вось што з людзьмі лянота робіць.

***— Ірына, не раўнуеце мужа да прыхаджан?***

**Ірына:** — Не.

**Уладзімір:** — Яна ведала, куды ідзе. Была папярэджаная.

**Ірына:** — Я таксама разумела, што акрамя ўвагі да мужа, будуць праяўляць цікавасць і да мяне. Журналісты будуць задаваць пытанні *(усміхаецца)*.

**Уладзімір:** — Быць жонкай пастара адна праблема — ты заўсёды на вачах. Як Іра кажа, немагчыма са мной па горадзе ісці. Паехалі неяк у Віцебск да маіх бацькоў, а там мяне ніхто не ведае. Іра здзівілася: глядзі, мы прайшлі колькі, і цябе ніхто не спыніў. А ў Гродне часта падыходзяць спытаць нешта, пагутарыць.

### «Святы адзначаем двойчы»

***— Жонка святара заўсёды ўяўляецца хатняй гаспадыняй...***

**Ірына:** — Лічу так: чаму я павінна прыходзіць з адной працы і выконваць іншую? Мы па гаспадарцы ўсё разам робім. Прыбіраемся, гатуем.

***— Хто ў сям'і пастара корміцель?***

**Уладзімір:** — Хто прынясе заробак, той і нясе матэрыяльную адказнасць *(смяецца)*. У нас няма дакладнага падзелу абавязкаў.

***— Што наконт свят у вашай сям'і?***

**Ірына:** — Два разы адзначаем: па праваслаўным і лютэранскім календары.

**Уладзімір:** — На лютэранскія Каляды абавязкова робім глінтвейн для прыхаджан. Звычайна набывалі, а сёлета я вырашыў прыгатаваць сам. У нас ёсць вячэрняя служба, дзе мы збіраемся ўсе разам, спяваем святочныя харалы. Прыхаджане пякуць булачкі. Каляды — маё любімае свята. Асабліва калі снег ёсць.

***— Як праводзіце вольны час? Ці часта ўдаецца кудысьці выбрацца?***

**Уладзімір:** — Вось як пажаніліся, амаль не было гэтай магчымасці.

**Ірына:** — Я праходзіла інтэрнатуру ў Брэсцкай вобласці і паўгода пасля вяселля ездзіла амаль за 200 кіламетраў у Гродна на выхадныя. З мая ўжо жыву тут. Калі застаёмся ў горадзе, то да сяброў ходзім, у кавярні, проста па Гродне шпацыруем. Часта ездзім да маіх бацькоў дапамагаць па гаспадарцы.

**Уладзімір:** — Хутка вось бульбу капаць паедзем, 25 сотак агарода як-ніяк. Сям'я святара — такія ж людзі, як і ўсе.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*lubneuskaya@zviazda.by*

**Фота з архіва герояў.**

*г. Гродна*

■

---

■ Пра галоўнае

# ЯК ЗАХАВАЦЬ АДНОСІНЫ?

**Не памылюся, калі скажу, што пераважная большасць людзей на планеце марыць пра моцную і шчаслівую сям'ю. Але далёка не ва ўсіх гэта мара збываецца. Колькасць разводаў з кожным годам расце... «Чамусьці многія, калі выходзяць з загса, забываюцца на тое, што над адносінамі трэба працаваць», — піша ў сваім блогу шчаслівы муж і тата Крысціян Рэй — прадзюсар крэатыўнага агенцтва Hollywood World. І дзеліцца ўласным досведам у выглядзе парад.**

1. **Навучыцеся прасіць прабачэння.** Шчыра. Без прызнання ўласнай віны не бывае сапраўднай блізкасці паміж людзьмі.
2. **Не насіце на сэрцы крыўду.** Гэта ўрэшце вас загубіць.
3. **Кажыце «КАХАЮ» часта і на ўсе лады.** Словы «Ты і так ведаеш, што я цябе кахаю» забудзьцеся назаўжды.
4. **Хадзіце на спатканне адно з адным, прычым часта.** Рабіце адно аднаму прыемнае. Дарыце кветкі, гатуйце нечаканыя святочныя вячэры.
5. **Не адмаўляйце адно аднаму ў сексе.** Секс — гэта свята кахання. Ён аб'ядноўвае сэрцы і разбурае сцены паміж каханымі.
6. **Не расставайцеся надоўга;** ніякая праца ці хобі не могуць быць важнейшымі за сям'ю.
7. **Сябруйце з тымі, хто шануе сям'ю.** Дрэнная кампанія псуе характар чалавека.
8. **Забудзьцеся на слова «развод».** Ніколі не выкарыстоўвайце яго, каб прыстрашыць партнёра.
9. **Праводзьце шмат часу з дзецьмі.** Не пакідайце іх надоўга на бабу, дзеда і на нянек. Яны вашы, ім патрэбны менавіта вы.
10. **Замест таго, каб купляць дзецям усё без разбору,** трэніруйце іх характар, розум і волю.
11. **Шмат размаўляйце адно з адным і дзецьмі.** Выключыце тэлевізар і камп'ютарныя гульні. Кантактуйце часта і доўга. Абмяркоўвайце тое, што вас радуе, дзяліцеся тым, што вас турбуе.
12. **Навучыцеся пераключацца з рэжыму «Як бы мне зрабіць па-свойму»** у рэжым «Як бы палепшыць жыццё каханага чалавека».
13. **Захоўвайце пачуцці, якія аднойчы паміж вамі разгарэліся, як скарб.** І памятайце — па-сапраўднаму шчаслівыя дзеці вырастаюць толькі ў шчаслівай сям'і.

**Падрыхтавала Наталля МАЎЧАНАВА**

■

# МУЖ ДЫ ЖОНКА СПЯВАЮЦЬ ЗВОНКА



Колькі на свеце прымавак пра мужа ды жонку — не злічыць! А жыццё падказвае ўсё новыя ды новыя. На рэспубліканскім фестывалі фальклору я пачуў яшчэ адну — пра тых, хто любіць паспяваць ды патанчыць. Яўгенія і Уладзімір Ісайкі з аграгарадка Сарачы Любанскага раёна ведаюць шмат народных песень ды бытавых танцаў. Разам з іншымі мясцовымі аматарамі фальклору яны выступаюць у складзе гурта «Расіца». Гэты калектыў адраджае старыя спевы, найгрышы, прыпеўкі, абрады, танцы.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**